Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. АЎТОРАК № 206 (28316)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Хто супраць абмежаванняў алкагольнага продажу?**

СТАР. 4



**Адкуль у дзяцей праблемы з пазваночнікам?**

СТАР. 7



**Няма вяселля без каравая**

СТАР. 8

# ПАД АПЕКАЙ НЯСВІЖСКАГА ЛЬВА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхарка Нясвіжа Таццяна ВАЛЧОК са сваёй аднагадовай дачкой Палінай каля скульптуры ў гонар культурнай і гістарычнай славы горада.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Важна, каб існуючыя ў краіне рэсурсы, а гэта датычыцца і драўніны, і макулатуры, былі перапрацаваны на нашых прадпрыемствах. Нельга дапускаць, каб каштоўная сыравіна, з якой можна атрымаць розныя вырабы — мэблю, паперу, кардон і іншае, ішла па невялікіх цэнах за мяжу, і потым вярталася да нас у выглядзе тых жа вырабаў, якія мы можам вырабіць самі. Неабходна загрузіць свае магутнасці, забяспечыць людзей работай і атрымліваць больш важкую эканамічную выгаду. Для гэтага ўрадам прыняты шэраг адпаведных мер па абароне інтарэсаў айчынных вытворцаў, забяспечанасці іх сыравінай».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9023 | ▼ |
| Еўра | 2,0704 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0305 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0742 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

16206>

■ Грошы

## КАРТКІ СУПРАЦЬ МАНЕТ

### Дэнамінацыя рубля падштурхнула насельніцтва часцей разлічвацца «пластыкам»

**Рэкордная актыўнасць сярод уладальнікаў банкаўскіх картак была адзначана ў нашай краіне гэтым летам. Тэндэнцыя працягваецца. Усяго за два месяцы сярэдняя колькасць безнаяўных трансакцый на адну картку павялічылася амаль у два разы. Інфармацыю аб гэтым прыводзіць прэс-служба аднаго камерцыйнага банка краіны, спасылаючыся на выніках аналізу актыўнасці сваіх кліентаў.**

СТАР. 4



■ Выпрабавана на сабе

## НЕ СЫПЦЕ СТОЛЬ НА РАНЫ

### Гісторыя аднаго рамонту

**Нядаўна мне патэлефанавалі суседзі: тэрмінова прыязджай! На трэцім паверсе прарвала трубу з гарачай вадой. Гаспадароў не могуць знайсці. Вада дайшла да першага паверха. Выклікала таксі і праз мінут дваццаць была на месцы. Аднак карціна, якую я ўбачыла, калі адчыніла дзверы ўласнай кватэры, пераўзышла ўсе мае страхі. Уся мэбля ў пакоі плавала, шпалеры адсталі ад сцяны, а вада са столі працягвала ліцца. Першая думка: а дзе ж кот? Ад жаху мой любімец забраўся на секцыю.**

Ну што ж, абы здароўе. А рамонт паціху зраблю. Тым больш, што пакой невялікі — 17 квадратных метраў. Гэтай справай я займалася неаднойчы, але цяпер вырашыла даверыцца прафесіяналам. Як толькі падлога і сцены высахлі, пачала шукаць будаўнікоў. Газеты, інтэрнэт стракацяць аб'явамі: зробім рамонт якасна, у тэрмін, нядорага. Спынілася на двух хлопцах. Прыляцелі яны хутка, нібы на крылах. Усё замералі, сказалі, якія матэрыялы купіць. Маўляў, каб не зацягвала, бо заўтра вечарам возьмуцца за справу і ўсё зробяць за два дні. А за работу запрасілі ўсяго каля двух мільёнаў рублёў. Кінулася ў краму, прадаўцы-кансультанты дапамаглі выбраць усё неабходнае. Вечарам тэлефаную па ўжо знаёмым нумары. Званок спачатку скідваюць, а затым наогул мабільнік адключаюць. На наступны дзень паўтараецца тое ж самае. Я ў роспачы. Знаёмая параіла мне жанчыну, якая працуе ў ЖЭСе: «Справілася з рамонтам маёй двухпакаёўкі за тры дні». Новая работніца прыехала таксама хутка. Агледзела жыллё і загнула за работу кошт амаль утрая большы, чым папярэднікі.

СТАР. 6